■ Вуліцы горада

# ПАБУДАВАЎ КВАТЭРУ САБЕ — ЗРАБІ І ДЛЯ ПТУШКІ

## У сталіцы з'явяцца шпакоўні і сінічнікі

**Гэта было б не так дзіўна, але павесяць іх не на звычайных дрэвах, а на намаляваных. Муралы (малюнкі на сценах), якія з'явіліся ў Мінску, «ажывуць». Такую ідэю распрацавала арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Старт праекта — наступнай вясной.**



Новыя методыкі азелянення ўрбаністычнай прасторы распрацоўвае Акадэмія навук.

У гарадскіх птушак існуюць дзве праблемы: месца для гнездавання і недахопы харчавання ўзімку. Даволі шмат шпакоўняў ужо існуюць у сталіцы. Але колькасць не ёсць якасць, расказвае **Карына САЛАВЕЙ, спецыяліст па развіцці АПБ:**

— Сёлета мы зрабілі дзесяць штучных шпакоўняў. Зараз мы прапануем людзям рабіць сінічнікі, бо маленькім птушкам недзе жыць. А шпакі бойкія і ўсё займаюць. У кронах намаляваных дрэў будуць размешчаны штучныя гняздоўі. З дапамогай спецыяліста-арнітолага мы прааналізавалі вуліцу. Прыродаахоўнік казаў, што на пэўнай адлегласці можна нармальна размясціць сінічнікі, і вялікая верагоднасць, што птушкі засеяцца. Яны не любяць блізкага суседства: асабістая прастора ёсць не толькі ў людзей. Цяпер у нас вядуцца перамовы з кавярнямі, якія знаходзяцца на вуліцы Кастрычніцкай. Мы прапанавалі зрабіць ім гарадскія кармушкі — гэта і карысць для птушак, і асалода для наведвальнікаў. Ёсць такая праблема, што птушкі харчуюцца не тым, чым трэба. А зараз мы прапануем прадаваць мяшочкі з чорнымі семкамі.

**Ігар КОРЗУН, прадстаўнік таварыства «Зялёная сетка»**, адзначае, што з боку эколагаў ёсць цікавасць прасунуць не проста архітэктурныя методыкі і рашэнні, а канцэптуальныя ідэі па азеляненні горада.

— Акадэмія навук па заказе дзяржавы даўно распрацавала розныя методыкі азелянення гарадской прасторы, «забітай» у выніку новабудоўляў, індустрыялізацыі і шэрагу іншых рэчаў. Гэта новыя методыкі рэнавацыі з улікам еўрапейскага і амерыканскага вопыту з выкарыстаннем раслін, як незвыклых для нашага клімату, так і пасрэдных, якія мы называем пустазеллем, але яны цікавыя для выкарыстання і ў практыцы азелянення. Выглядаюць яны прывабна. Праўда, нельга пайсці на пустку і іх назбіраць. Супрацоўнікі Акадэміі навук, у прыватнасці Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча, ужо даўно займаюцца працамі па селекцыі абарыгенных травяністых раслін. Напрыклад, міскантус. Чым ён добры? Ён хутка ідзе ў рост, вельмі высокі, дае багатую зялёную масу і пышна выглядае нават у зімовы перыяд. Тады, калі яго травяністая частка адмірае, сваім залацістым колерам ён упрыгожвае і зімовы пейзаж. Плюс да ўсяго, ён не можа распаўсюджвацца бескантрольна. Добра загароджвае некаторыя гарадскія часткі, якія не вельмі цешаць наш погляд.

**Прадстаўнік Інфармацыйнага цэнтра па пытаннях хімічнай бяспекі і адходаў Цэнтра экалагічных рашэнняў Наталля БЛЫШЧЫК** занепакоена асобным зборам смецця на вуліцах:

— Кантэйнеры для паперы мы вырашалі не ставіць, таму што гэта такі матэрыял, які прыдатны для перапрацоўкі ў чыстым выглядзе. А тое, што тут будзе збірацца, хутчэй за ўсё, будзе брудным. Папяровы посуд — адна з самых вялікіх бед усіх эколагаў. Яны не перапрацоўваюцца, а імгненна становяцца адходамі. Прычым іх выкарыстанне яшчэ нясе і пэўную шкоду для здароўя. На папяровы посуд знутры нанесена пластыкавая плёнка, якая пад уздзеяннем высокіх тэмператур вылучае шкодныя рэчывы. Адна з ініцыятыў — паменшыць іх колькасць. Я хаджу са сваім кубкам, шкляным або з пластыку, прыдатнага для шматразовага выкарыстання. У кафэ мне наліваюць у мой кубак і часам нават робяць зніжку.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

■ Сацыяльнае партнёрства

# СТАЎКА НА ВАЛАНЦЁРАЎ

## Беларускі Чырвоны Крыж зацвердзіў стратэгію на наступныя пяць гадоў

**Сярод асноўных напрамкаў дзейнасці — рэагаванне на надзвычайныя і крызісныя сітуацыі, медыцынская дапамога, сацыяльная падтрымка і догляд дома, абарона інтарэсаў уразлівых груп, адукацыя і інфармаванне насельніцтва.**

— Тыя праекты, якія сёння ажыццяўляюцца, напрыклад, падтрымка людзей з псіхічнымі захворваннямі, сацыяльная адаптацыя былых асуджаных, атрымаюць працяг, — запэўніў **генеральны сакратар Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа Віктар КАЛАБАНАЎ** на XXIII з'ездзе арганізацыі.

Ён таксама адзначыў, што мінулая пяцігодка была вельмі паспяховай. Павялічыўся штат сёстраў міласэрнасці (са 122 да 147 ставак), вырасла колькасць валанцёраў (калі ў 2011 годзе іх было 21 тысяча чалавек, то ў 2015-м — 22,7 тысячы). Была створана служба рэагавання на надзвычайныя сітуацыі, запушчаны новы праект, які папулярызуе здаровы лад жыцця.

Палепшылася фінансавая сітуацыя арганізацыі. За папярэднія пяць гадоў Беларускі Чырвоны Крыж прыцягнуў у краіну 9,6 мільёна долараў. Гэтыя інвестыцыі былі накіраваны на падтрымку найбольш уразлівых катэгорый насельніцтва. А паступленні бязвыплатнай замежнай дапамогі павялічыліся за гэты перыяд у чатыры разы.

— Дзяржаве выгадна працаваць з грамадскімі арганізацыямі, бо прыцягваюцца дадатковыя і фінансавыя, і чалавечыя рэсурсы, — лічыць **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама і старшыня прэзідыума абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Віктар ЛІСКОВІЧ**. — Гэтым самым мы здымаем нагрузку з бюджэту і ў той жа час паляпшаем якасць жыцця людзей, якія маюць патрэбу ў доглядзе.

*На з'ездзе выбралі таксама новага генеральнага сакратара таварыства. Ім стала Вольга МЫЧКО, якая раней працавала галоўным урачом бальніцы паліятыўнага догляду «Хоспіс», а цяпер з'яўляецца дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.*

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# На фальшывыя грошы купіў дзяўчыне абутак

**У міліцыю звярнулася жанчына, якая расказала, што малады чалавек набыў у яе дзве пары абутку, а расплаціўся фальшывымі грашыма. Праўда, засумнявалася жанчына ў сапраўднасці купюр толькі дома.**

На працягу некалькіх гадзін хлопец быў затрыманы. Па інфармацыі Маскоўскага РУУС г. Мінска, ім аказаўся 22-гадовы жыхар Гомеля. Малады чалавек патлумачыў, што на такі адчайны крок ён пайшоў дзеля... сваёй дзяўчыны, якой паабяцаў купіць дзве пары абутку. Тавар, які прывезла знаёмая дзяўчыны, ён атрымаў у Мінску і расплаціўся за яго фальшывымі грашыма (7 купюр наміналам 50 дэнамінаваных рублёў). Затрыманы прызнаўся, што надрукаваў грошы самастойна дома, падчас следчых дзеянняў былі выяўлены і канфіскаваны ў якасці рэчыўных доказаў злачыннай дзейнасці капіравальная машына, аргтэхніка, прынтар і падрыхтаваныя для вырабу купюр лісты з надрукаванымі фальшывымі 50-рублёвымі купюрамі. Маладому чалавеку можа пагражаць да 7 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# Валацуга з элегантнай сумкай

**Такое нелагічнае спалучэнне адразу прыцягнула ўвагу дарожнага патруля. А калі чалавек літаральна пабег цераз пераход на чырвоны сігнал святлафора, супрацоўнікі міліцыі зразумелі, што трэба затрымліваць. І як высветлілася, не памыліліся — расказала супрацоўніца Брэсцкага абласнога ўпраўлення ДАІ Наталля САХАРЧУК.**

Чалавек гэты аказаўся асобай без пастаяннага месца жыхарства, знешні выгляд быў таму красамоўным сведчаннем, а вось элегантная дамская сумка яму мала пасавала. Ды ён і не стаў адпірацца, калі прывезлі для разбору ў Маскоўскі РАУС Брэста. Сумленна расказаў, што маёмасць украў, а скарыстацца чужым не паспеў. У сумцы побач з кашальком ды іншымі рэчамі знаходзіўся мабільны тэлефон, таму гаспадыню знайшлі хутка.

Злодзей затрыманы. Адсутнасць пастаяннага месца жыхарства, як вядома, не вызваляе ад крымінальнай адказнасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■ Факт

# Ці ёсць на рынку антыканкурэнтныя пагадненні?

## Гэта будзе праверана ў дачыненні да шэрагу тавараў

**Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю ў рамках ускладзеных на яго паўнамоцтваў прыступіла да ацэнкі стану таварных рынкаў мяса свініны, птушкі, жывой рыбы і малака.**

Мэта — выяўленне і спыненне парушэнняў заканадаўства ў галіне процідзеяння манапалістычнай дзейнасці і развіцця канкурэнцыі, а таксама парушэнняў парадку правядзення працэдур дзяржаўных закупак і закупак за кошт уласных сродкаў (у выпадках, калі іх правядзенне з'яўляецца абавязковым у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь).

У прыватнасці, забароне падлягаюць пагадненні, узгодненыя дзеянні паміж канкурэнтамі, што дзейнічаюць на адным таварным рынку, якія маюць або могуць мець сваім вынікам раздзел таварнага рынку па тэрытарыяльным прынцыпе, аб'ёмах здзелак, відах, аб'ёмах тавараў і іх цэнах (тарыфах), коле прадаўцоў альбо спажыўцоў; выключэнне або абмежаванне доступу на таварны рынак іншых гаспадарчых суб'ектаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Студэнты змогуць вывучаць мову ўрду

**Пагадненне аб узаемным прызнанні дакументаў аб адукацыі падпісана паміж урадамі Беларусі і Пакістана. Аб гэтым паведамляе прэс-служба Міністэрства адукацыі нашай краіны.**

Акрамя таго, падпісана Пагадненне паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам федэральнай адукацыі і прафесійнага навучання Ісламскай Рэспублікі Пакістан аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі, а таксама шэраг пагадненняў паміж ВНУ.

Беларусь і Пакістан будуць развіваць адукацыйнае супрацоўніцтва паміж Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, БДУ і Акадэміяй дыпламатычнай службы Пакістана, БДУ і Універсітэтам Каіды-і-Азам, БДУ, БДУІР і Інстытутам інфармацыйных тэхналогій Пакістана, БДУІР і Нацыянальным універсітэтам навукі і г.д.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Здарэнні

# СТРЭЛЫ Ў ЛЕСЕ

**У інтэрнэце з'явіліся ролікі і паведамленні аб выкраданні мужчыны з Маларыцкага раёна, якое быццам бы здзейснілі пад пагрозай невядомыя. Вось што паведаміў з гэтай нагоды начальнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў Брэсцкага абласнога УУС Сяргей ДУЧЭНКА:**

— Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Брэсцкага РАУС і палка ППСМ УУС у прыватным доме вёскі Арлянка Маларыцкага раёна затрымалі 55-гадовага мужчыну. Ён знаходзіўся ў міждзяржаўным вышуку па абвінавачванні ў здзяйсненні насілля ў адносінах да супрацоўніка органаў унутраных спраў.

У час яго канваіравання ў Брэст аўтамабілі знаёмых і сваякоў сталі перашкаджаць руху службовага аўтамабіля. На сірэну, пробліскавыя маячкі, а таксама патрабаванне ўступіць дарогу вадзіцелі не рэагавалі. Для спынення транспарту аднаго з правапарушальнікаў супрацоўнікі міліцыі выкарыстаў зброю. Ён выстраліў у паветра, але вадзіцель не зрэагаваў. Затым міліцыянер выстраліў у правае задняе кола і тым самым прымусіў машыну спыніць рух.

На месца здарэння прыбыла аператыўна-следчая група. Усе ўдзельнікі канфлікту ўстаноўлены. Зараз з імі працуюць следчыя СК, заведзена крымінальная справа.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# НЕБЯСПЕЧНЫЯ ЗАКЛАДКІ «ГРУЗЧЫКА»

**Нарадам Кастрычніцкага (г. Мінска) Дэпартамента аховы, які нёс службу ў раёне вуліцы Асаналіева, затрыманы 23-гадовы раней не судзімы жыхар сталіцы, які займаўся распаўсюджваннем асабліва небяспечнага псіхатропа.**

Увагу супрацоўнікаў міліцыі прыцягнуў малады чалавек, які хадзіў ад пад'езда да пад'езда і капаўся ў зямлі. Заўважыўшы дзіўныя паводзіны хлопца, супрацоўнікі міліцыі затрымалі яго. У ходзе асабістага вобыску ў мінчаніна было канфіскавана 10 грамаў асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва, расфасаванага па пакеціках, абматаных ізастужкай. Хлопец паказаў месцазнаходжанне яшчэ 20 закладак, якія ён паспеў зрабіць. Акрамя гэтага, у мабільным тэлефоне затрыманага знойдзены тэкставы файл з месцамі закладак.

Паводле інфармацыі Кастрычніцкага РУУС г. Мінска, па месцы жыхарства фігуранта канфіскавана нерасфасаванае парашкападобнае рэчыва масай 65 грамаў, электронныя вагі і іншае, неабходнае для фасоўкі дробных партый забароненых рэчываў і далейшай іх рэалізацыі шляхам закладак. Таксама ў кватэры затрыманага былі знойдзены грошы ў суме 1300 рублёў і багатая калекцыя нажоў.

Затрыманы расплумачыў, што ўладкаваўся рабіць закладкі ў канцы ліпеня, працаваў на інтэрнэт-краму. Атрымліваў у пастаўшчыкоў па 100 грамаў псіхатропнага рэчыва, фасаваў і раскладваў дробныя закладкамі. Пры гэтым сам наркотыкі не ўжываў. Маці затрыманы расказваў, што па начах працуе грузчыкам. Маладому чалавеку пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*